НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Дзяржаўная навуковая ўстанова
«ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАН БЕЛАРУСІ»

Філіял «ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА,
ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ»

# ЗБОРНІК ДАКЛАДАЎ І ТЭЗІСАЎ VI МІЖНАРОДНАЙ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ «ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНЫ СТАН КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

(Мінск, Беларусь, 19–20 лістапада 2015 года)

Мінск
«Права і эканоміка»
2016

УДК [008+7](06)6.09
ББК 63.5
341

Рэдакцыйная калегія:
А. І. Лакотка (галоўны рэдактар), В. А. Арловіч, М. Р. Баразна,
Ю.П. Бондар, У.Р. Гусакоў, К. М. Дулава, А. А. Каваленя, А.А.Лукашанец,
У. І. Пракапцоў, Я. М. Сахута, Б. У. Святлоў

341 **Зборнік** дакладаў і тэзісаў VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (Мінск, Беларусь, 19–20 лістапада 2015 года) /гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2016. – 854 с.

ISBN 978-985-552-585-2.

У зборніку змяшчаюцца даклады і тэзісы ўдзельнікаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў», якая адбылася 19–20 лістапада 2015 года ў г. Мінск. Публікуюцца даследаванні ў галіне архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, тэатразнаўства, музыкі, кіно, экранных відаў мастацтва. Разглядаюцца актуальныя задачы сучаснай культуры і захавання нацыянальных культур і гістарычна-культурнай спадчыны ў сучасных умовах.

Кніга адрасуецца мастацтвазнаўцам, этнолагам, фалькларыстам, усім, хто цікавіцца традыцыйнай беларускай культурай.

**УДК [008+7](06)6.09**
**ББК 63.5**

**ISBN 978-985-552-585-2**

© ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», 2016
© Афармленне. ВТАА «Права і эканоміка», 2016

На основании определенного педагогического опыта, предлагаем методические рекомендации для работы над полифоническим произведениями.

1. Сначала необходимо выявить композиционные основы полифонического произведения и фактурные компоненты полифонической ткани.

2. Важное значение имеет работа над динамикой. Необходимо понимать и создавать динамику, ориентированную на жанрово-стилистическую модель.

3. При работе над полифоническими произведениями важным является определение темпа, ритма, а также возможность применения агогики. Чаще всего установленный вначале темп должен быть выдержан до конца. В этой связи, важное значение будет иметь присущее исполнителю чувство художественного вкуса и меры.

4. Важнейшее значение при работе над полифоническими произведениями имеют вопросы аппликатуры и распределение голосов между партиями правой и левой рук. Аппликатура должна быть правильно подобрана, с расчетом метроритмических, структурных, динамических особенностей слоев полифонической ткани произведения. Так, при распределении голосов между партиями правой и левой рук важно помнить, что, в частности тема фуги не делится между клавиатурами.

5. Важной проблемой при работе над полифоническими произведениями является ведение и смена меха, артикуляция и штрихи, так как наличие протяженных эпизодов с непрерывной (цепной) фразировкой, динамических контрастов, а также разнообразие артикуляционных штрихов и их несовпадение в разных голосах требуют от исполнителя наличие хорошей техники меховедения. Особой сложностью является достижение штриховой градации в разных голосах фактуры.

Уже на начальном этапе обучения в классе на уроках по специальности необходимо организовывать работу, направленную на развитие полифонического слуха и овладение учащимися различными видами полифонии. Эффективными представляются следующие формы и методы работы, синтезирующие усилия педагогов по специальности и музыкально-теоретических дисциплин. Необходимо взаимовлияние сфер обучения: на занятиях по специальности заботиться о развитии слуховых данных, в частности способности слышать полифонию, а на уроках по музыкально-теоретическим дисциплинам – выполняя программы освоения предметов сольфеджио, теории музыки, гармонии необходимо ориентироваться на специальность ученика. Именно в условиях такого дисциплинарного синтеза реально достичь улучшения ситуации с развитием навыков слышания полифонической музыки разных эпох и стилей.

**ЛИТЕРАТУРА**


1. Бубен, В.П. Теория и практика обучения игры на аккордеоне / В.П. Бубен. – Мн.: БГПУ, 2005. – 270 с.
2. Каузова, А.Г. Теория и методика обучения игре на Фортепиано / А.Г. Каузова, А.И.Николаева. – СПб.: Владос, 2001. – 273 с.
3. Медушевский, В.В. О закономерностях и средствах художественного воздействия музыки. - М.: Музыка, 1976. – 254с.
4. Назайкинский, Е.В. Звуковой мир музыки / Е.В. Назайкинский. – М.: Музыка, 1988. – 254 с.
5. Назайкинский, Е.В. Логика музыкальной композиции / Е.В. Назайкинский. – М.: Музыка, 1982. – 319 с.
6. Назайкинский, Е.В. О психологии музыкального восприятия / Е.В. Назайкинский. – М.: Музыка, 1972. – 384 с.
7. Солопов, М.Г. О музыке, о времени, о музыкантах / М.Г. Солопов. – Минск: Белорусская государственная академия музыки, 2012. – 188 с.
8. Старчеус, М.С. Слух музыканта / М.С. Старчеус. – М.: МГК, 2003. – 639 с. – (Психология: о музыкантах, для музыкантов).
9. Теплов, Б.М. Психология музыкальных способностей / Б.М. Теплов. – М. – Л.: Издательство Академии педагогических наук, 1947. – 213 с.
10. Цагарелли, Ю.А. Психология музыкально-исполнительской деятельности: учеб. пособие / Ю.А. Цагарелли. – СПб.: Композитор, 2008. – 368 с.



***Трафімчук Т.Ю.***

*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*


## АСАБЛІВАСЦІ ЖАНРАВАЙ ФУНКЦЫІ АРКЕСТРАВАЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XX – ПАЧ. XXI СТСТ., ПРЫСВЕЧАНАЙ ВОБРАЗАМ ЭПОХІ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ

Разгляд сімфанічных і народна-аркестравых твораў беларускіх кампазітараў апошняй трэці XX – пачатку XXI стст. выявіў шматпланавасць індывідуальна-аўтарскіх падыходаў да рашэння вобразаў эпохі Сярэдневякоўя ў буйных музычных жанрах. Пры гэтым высветліўся і шэраг тыповых рыс, якія кансалідуюць цэлы пласт музычнай творчасці айчынных аўтараў праз асобае, выразнае маркіраванне і мастацкае ўвасабленне сюжэтаў сярэдневяковай эпохі.

Сімфоніі, сімфанічныя паэмы і фрэскі, звернута да вялікай аўдыторыі, звычайна прыцягваюць увагу як творы філасофскага характару, якія ў стане трактаваць вечныя праблемы чалавечага быцця, дзе

індывідуальнае светаадчуванне падпарадкоўваецца ўсеагульнаму, універсальнаму. Адначасова яны з’яўляюцца і эмацыянальна насычанымі музычнымі тэкстамі, якія апелююць не толькі да розуму слухача, але да яго асабістых перажыванняў.

Аснову іх парадыгматыкі складае творчае асэнсаванне асобага сакрума Сярэдніх вякоў. Яго мастацкая топіка азначана зваротам да вядучых культурна-гістарычных дамінант эпохі (рэлігійнасці, сімвалізму, культурнага сінтэтызму і традыцыяналізму), а таксама да сімвалічных вобразаў, месцаў, падзей беларускай мінуўшчыны (Полацк, Ефрасіння Полацкая, Каложа, Полацкая Сафія, Крэва, Грунвальдская бітва). Запатрабаваныя і дзейсныя ў розных аўтарскіх сачыненнях вылучаныя топасы не толькі ўнутрана аб’ядноўваюць адметныя музычныя рашэнні «сярэдневяковасці», але па-за часам, прасторай абвяшчаюць агульнакультурныя, нацыянальныя каштоўнасці і фармуюць духоўнае «поле» сучаснасці.

Пэўным чынам беларускіх кампазітараў яднае творчы падыход, вытрыманы ў модусе «гістарычнай інверсіі» і накіраваны на мастацкую ідэалізацыю і паэтызацыю сярэдневяковай даўніны. Ва ўнутраным змесце іх сімфанічных і народна-аркестравых твораў фактаграфічная дакладнасць замяняецца ўмоўнасцю, а дакументальнасць – мастацкай метафарай. Не менш вызначальнай якасцю музычных тэкстаў становіцца прасягнутасць кранальна-настальгічным духам, аўтарскімі суб’ектыўнымі перажываннямі і эмацыянальнымі музычнымі выказваннямі. Гэта адбіваецца на прэваляванні «нацыянальна-рамантычнай» плыні, што суадносіцца з рамантычнымі і познерамантычнымі мастацка-стылевымі тэндэнцыямі.

Пры ўвасабленні сярэдневяковых тэм і сюжэтаў аркестравыя творы айчынных кампазітараў дэманструюць разнастайнасць яе індывідуальна-аўтарскіх трактовак і мастацка-філасофскіх пасылаў, закладзеных у змесце. Гэта шматгранна раскрываецца праз шматлікія інтэртэкстуальныя сувязі, алюзіі, асацыяцыі, якія нават у межах увасаблення агульнай тэмы надаюць непаўторнасць, унікальнасць кожнаму сачыненню.

Пазамузычны фактар з’яўляецца вызначальным у сярэдневякова арыентаваных аркестравых творах беларускіх кампазітараў не толькі ў плане зместу, дзе спрыяе нараджэнню зместу, але пры гэтым «не можа быць зведзены да зыходнага імпульсу, а непазбежна аказваецца больш шырокім, аб’ёмным, надзяляецца якасцю абагульненай канцэпцыі – багатай і шматаспектнай» [1, с. 8]. Ён з’яўляецца выразным правадыром да ўнутранай семантыкі, «служаць каналам, злучным звяном паміж агульным эстэтычным мысленнем эпохі і яго музычным выразам» [2, с. 22]. Найбольш ярка гэта праяўляецца праз топіку слова.

Вербальны складнік арганічна пранікае ў творы, прысвечаныя тэме Сярэдневякоўя, чым пашырае іх першапачаткова-утваральную аснову якасна новымі сродкамі і магчымасцямі. Слова, прадстаўленае ў праграмных пазначэннях і ўжыванні старажытных або стылізаваных тэкстаў, па-першае выклікае шэраг яркіх асацыяцый, якія апелююць да «слоўніка» гістарычна сфармаваных сімвалаў і культурных кодаў. Па-другое, выкарыстаныя аўтарамі тэкставыя ўзоры ўзмацняюць элемент «архаікі». Па-трэцяе, пасродкам увядзення вербальнага (таго, што прамаўляецца і/або прапяваецца) кампанента нівялюецца той міжжанравы разрыў, які ўзнікае паміж аркестравымі і тэатральна-сцэнічнымі творамі. Тым самым пэўным чынам кампенсуецца тая «дысбалансаванасць», якая вылучае і адрозніваe музычна-жанравы кантэкст беларускай «сярэдневяковай» музыкі XX – пач. XXI стст.

Інтэртэкстуальнасць праймае і многія іншыя кампаненты сінтагматыкі музычных тэкстаў, што акцэнтуе іх нелінейную сутнасць. Агульна ўласцівую топіку аркестравых сачыненняў складаюць буйныя маштабы і складаныя формы, вялікі выканальніцкі склад, адпаведныя сцэнічна-акустычныя магчымасці, характэрныя каноны ўнутранай структурнай арганізацыі і іх узаемадзеянне з пэўным наборам сродкаў выразнасці. Адметнымі мастацкімі топасамі твораў, прысвечаных сярэдневяковай тэме, з’яўляюцца прапушчаныя праз прызму дыялогу часава аддаленых культур старажытныя музычныя і вербальныя крыніцы, жанры (з іх аўтарскімі варыянтамі), таксама пэўныя сродкі музычнай выразнасці, выканальніцкія склады і тэмбры. Асобая значнасць апошніх падкрэслена наданнем ім сімвалічнай ролі, якая ўзводзіць кожны кампанент на новы, экстрамузычны і экстрамастацкі ўзровень.

Усё названае выводзіць у культурна-мастацкім і музычна-жанравым кантэксце пласт сімфанічнай і народна-аркестравай творчасці беларускіх кампазітараў апошняй трэці XX – пач. XXI стст., прысвечанай тэме Сярэдневякоўя, на ўзровень асобай з’явы, якая сканцэнтравала і align="" рознабакова прадставіла высока канцэптуальныя абагульненні мастацкіх уяўленняў аб ролі і значэнні тэмы гістарычна-сярэдневяковай мінуўшчыны ў надзённых рэаліях сучаснасці.

Інкрустацыі ў мастацкі тэкст элементаў, характэрных для стыляў рознай ступені даўніны, свядома акцэнтаваныя стылізацыі, тонка (або, наадварот, рэльефна) пададзены рэтраспектывізм – ахопліваюць, як сведчыць гісторыя мастацтва, розныя перыяды культурнага руху. Адпаведна, суіснаванне розных па гістарычных каардынатах культурных тэкстаў, сімвалаў і знакаў становіцца натуральнай з’явай у сітуацыі культурнага дыялогу.

Мастацкая свядомасць дапускае даволі вольнае абранне і выкарыстанне любых прататыпаў, што цалкам адпавядае творчаму прынцыпу «вольнага выбару» або «гульні са стылямі». Аднак у тым выглядзе, як праявіла сябе тэндэнцыя гістарызму ва ўсходнееўрапейскім музычным мастацтве ў перыяд другой паловы XX – пач. XXI стст. абранне з фонду культурна-гістарычнай спадчыны эпохі Сярэдніх вякоў з'яўляецца невыпадковым.

У музычнай культуры краін Усходняй Еўропы (Расіі, Украіне, Польшчы, Літве) сувязі з сярэдневяковай даўніной заставаліся вельмі моцнымі. Яны праяўляліся не толькі ў звароце да розных сюжэтаў старажытнай гісторыі, але і ў свабоднай пралангацыі традыцый, форм і жанраў царкоўнай культуры (як каталіцкай, так і праваслаўнай). Гэта выразна адбілася на сучасным успрыняцці і ўсведамленні «сярэдневяковасці», якое праяўляе сябе як на шырокім узроўні культуры, так і ў асобных яе сферах. Прынамсі, у музычным мастацтве разгледжаныя ў даследаванні польская і літоўская школы дэманструюць даўнюю традыцыю прафесійна-акадэмічнай даследчыцкай і выканальніцкай дзейнасці у галіне музычнай медыявістыкі, якая праходзіць на спецыялізаваных кафедрах, аддзелах, факультэтах пры дзяржаўных установах музыкі. Акрамя гэтага, важнай складаючай еўрапейскай культуры другой паловы XX – пач. XXI стст. з'яўляецца шырокае гучанне сярэдневяковай музыкі, рэканструяванай і/або стылізаванай, якое даволі распаўсюджана ў пазаакадэмічным – аматарскім, эстрадным – асяроддзі.

Значную ролю ва ўсталяванні непарыўнай (неперарванай) сувязі сучаснасці з даўнімі пластамі гісторыі адыгрывае багаты культурны ландшафт (старажытныя замкі, храмы), мноства помнікаў (скульптуры, габелены, кнігі, узоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва), якія захаваліся ў гарадах Польшчы, Літвы, Расіі, Украіны з часоў далёкай эпохі. Яны не толькі фармуюць асобую атмасферу гістарычнасці, але і спрыяюць незнікненню і адчуванню актуальнасці культурнага дыялогу з даўнім часам Сярэдніх вякоў. Найбольш відавочнымі і магутнымі цэнтрамі паўстаюць даўнія замкі, касцёлы, саборы, манастыры, абарончыя і іншыя пабудовы.

Актуалізацыя ўвагі да сярэдневяковай эпохі ў расійскіх, украінскіх, польскіх і літоўскіх кампазітараў пераважна праявіла сябе праз прызму новага адраджэння сакральнасці (ars sacra), што адлюстравалася ў такой музычнай плыні, як nova musica sacra. У яе рэчышчы сучасныя аўтары ў разнастайных жанрах, часцей звязаных са словам (літургія, стыхіра, канон, малітва, меса, рэквіем, літанія, гімн, мадрыгал) звярнуліся да духоўных каштоўнасцей і мастацкіх артэфактаў сярэдневяковай мінуўшчыны. Сутнасцю гэтага з'явілася спроба супрацьстаяць распаду сучаснага свету шляхам стварэння новага культурнага сінтэзу, які здзяйсняецца на перакрыжаванні розных культур і традыцы і пашырае сакральную прастору, якая існуе ў літургіі, за яе межы.

Дзякуючы фонду музычных помнікаў, якія не толькі ў вялікай колькасці захаваліся ў архіўных, бібліятэчных сховішчах, але на працягу стагоддзяў выклікалі цікавасць навукоўцаў-музыказнаўцаў, а таксама ўтрымлівалі свае пазіцыі ў жывой канцэртна-выканальніцкай практыцы, у храмавым асяроддзі – польскія, літоўскія, расійскія і украінскія кампазітары другой паловы XX – пач. XXI стст. прадставілі ў сваёй творчасці шмат версій такога музычнага ўвасаблення «сярэдневяковасці», якое карэлюе з творчымі імкненнямі рэстаўрацыйнага кшталту або набліжанай да арыгіналу стылізацыі. Важнымі пры гэтым становяцца звароты да сапраўднага музычнага матэрыялу, жанрам і тэкстам Сярэдніх вякоў.

Немалаважнай плынню ва ўсходнееўрапейскіх творцаў засталася індывідуальна-аўтарская трактоўка сюжэтаў і вобразаў старажытнай эпохі. Уведзеная ў парадыгму пэўнай творчай задумы і адметнага кампазітарскага стылю тэма Сярэдневякоўя знаходзіць свае ўвасабленне ў модусе постмадэрнісцкай вольнай гульні са стылямі, дзе могуць свабодна спалучаюцца сярэдневяковы аскетызм і экспрэсіўнасць, маляўнічасць сучаснай музыкі.

У беларускім музычным мастацтве зварот да тэм і сюжэтаў Сярэдневякоўя праявіў сябе з 1970-хх гг. і пры пэўных паралелях с мастацкімі тэндэнцыямі суседніх заходнееўрапейскх краін набыў шэраг спецыфічных адметнасцей.

З аднаго боку, у статусе тэндэнцыі мастацкага гістарызму сувязь са спадчыны мінулай эпохі паўстала асабліва дзейснай у агульна культурнай сітуацыі, калі з'явілася не толькі ідэйным стрыжнем, эстэтычнай асновай мастацкай творчасці, але і важнейшай характарыстыкай сацыяльна-культурнага асяроддзя. Іншымі словамі, важным стаў факт увагі кампазітараў да асобных аб'ектаў, стыляў, артэфактаў, якіх сталі, па сутнасці, адлюстраваннем гістарычнай скіраванасці грамадскай свядомасці ў цэлым.

З другога боку, менавіта сакральныя інтэнцыі эпохі Сярэдніх вякоў, яе духоўнасць, маральна-этычная «ўстойлівасць», якія часта ў музычных творах выступаюць характарыстыкамі старажытнай мінуўшчыны і супрацьпастаўляюцца надзённай мітусні сучаснасці, сталі асабліва запатрабаванымі ў сітуацыі «разбуранага Дому» беларускай культуры апошняй трэці XX – пач. XXI стст.

Паказальна, што ў музычнай творчасці адным з першых і яркіх выразнікоў цікавасці кампазітараў да культурнага дыялога са сярэдневяковай эпохай з'явіліся сімфанічныя і народна-аркестравыя творы. Ме-

навіта яны ў кантэксце беларускага музычнага мастацтва занялі асобае месца і выканалі важную, вызначальную ролю як на міжжанравым узроўні, так і ў межах адной жанравай сферы.

Паводле ўніверсальнага закону функцыянавання музычных жанраў, вызначанага В. Конэн [2], менавіта ў межах тэатральна-сцэнічных або ў тых творах, якія ўтрымліваюць вербальны і/або ярка выяўлены рэпрэзентатыўны элемент, першапачаткова «праходзяць апрабацыю», зацверджваюцца і развіваюцца вядучыя ідэйна-эстэтычныя інтэнцыі і тэматычна-вобразныя прыярытэты пэўнай эпохі або гістарычна-культурнага перыяду. Такога роду ўсталёўкам, перш за ўсё, адпавядаюць опера, балет, меса, – якія звычайна і станавіліся выразнікамі кампазітарскіх духоўных пошукаў розных школ і часоў.

У беларускім музычным мастацтве апошняй трэці ХХ – пач. ХХІ стст. склалася прымячальная і парадаксальная сітуацыя, у якой менавіта невербальныя ў сваёй аснове сімфоніі, паэмы, фрэскі для сімфанічнага і народнага аркестра адны з першых найбольш поўна адлюстравалі эмацыянальны водгук мастакоў на культуныя тэндэнцыі сучаснасці і шматмерна раскрылі яго асэнсаванае абагульненне, пададзенае ў выглядзе цэласна сфармаваных канцэпцый буйнамаштабных сачыненняў. Пры гэтым слоўны і сцэнічны кампаненты у пэўным сэнсе не былі цалкам згублены ў жанрах «чыстай» музыкі. Айчынныя кампазітары кампенсавалі гэта ментальна-знакавымі праграмамі, выразнай драматургіяй, багатай унутранай сімволікай і мастацкай топікай твораў. Пры гэтым вобразны свет старажытнай эпохі знайшоў увасабленне ў беларускіх кампазітараў праз маляўнічае ўвасабленне тэм і сюжэтаў гісторыі менавіта беларускага Сярэдневякоўя.

Аркестравыя жанры перанялі таксама і тую пасіянарную функцыю, сумежную з функцыяй замяшчэння, якую б у іншых сацыяльна- і культурна-гістарычных варунках маглі б выканаць тэатральна-сцэнічныя творы. Яны не толькі храналагічна апярэдзілі, але ў пэўнай ступені падрыхтавалі і стымулявалі з’яўленне звернутых да Сярэдневякоўя опер, балетаў, кантат, араторый, а таксама іншых жанраў беларускай музыкі. У гэтай сувязі можна вылучыць і падкрэсліць значэнне камерных інструментальных і вакальна-інструментальных твораў айчынных кампазітараў. У дачыненні да аркестравых сачыненняў яны паўсталі своеасаблівым жанравым «спадарожнікам», аказалася найбольш блізкімі па стылёвай парадыгме, творчым падыходам, інтэрпрэтацыі і музычнага ўвасаблення тэмы Сярэдневякоўя.

Цесная ўзаемасувязь з актуальнымі тэндэнцыямі сучаснага ўсходнееўрапейскага музычнага мастацва (nova musica sacra, постмадэрнісцкая гульня са стылямі, музычна-мастацкія акцыі рэстаўрацыйнага і рэканструктыўнага кшталту) арганічна яднаюць гістарычна скіраваную дзейнасць кампазітараў і музыкантаў Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Беларусі. Пры гэтым большая часавая сціснутасць, асобае стаўленне да вобразнага свету Сярэдневякоўя, адметнасці міжжанравай і ўнутрыжанравай дынамікі, а таксама спецыфіка зместу і мастацкіх форм увасаблення сярэдневяковай эпохі вылучаюць беларускую музыку і, прынамсі, аркестравую творчасць у святле агульнакультурнага кантэксту.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Арановский, М.Г. Симфонические искания: проблема жанра симфонии в советской музыке 1960 – 1975 гг. / М.Г. Арановский. – Л.: Советский композитор, 1979. – 287 с.
2. Конен, В.Д. Театр и симфония. Роль оперы в формировании классической симфонии. – М.: Музыка, 1968. – 351 с.



***Успенский К.О.***

*(Республика Беларусь, г. Минск)*


## О НЕКОТОРЫХ ОСОБЕННОСТЯХ ПОДХОДА К ЗВУКУ В РЕЛИГИОЗНО-МИСТИЧЕСКОМ МИРОВОЗЗРЕНИИ

Духовное пробуждение и исцеление человека (понимаемое в самом широком и глубоком смысле слова, как обретение целостности всего его существа), по сути, является основной целью религиозно-мистических традиций мира, особых эзотерических течений в рамках мировых религий. Поэтому на протяжении столетий и даже тысячелетий их существования разрабатывались различные методы реализации этой сложнейшей задачи. Одними из самых действенных способов для этого, доказавшими свою обоснованность и эффективность, явились практики с использованием музыки. Почти во всех культурах, имевших глубинную связь с сакральным началом бытия, музыка активно привлекалась к процессу просветления человеческих существ и как часть религиозного ритуала, и как элемент мистической практики. Так, христианский мистик Р. Льюис утверждает, что «идет ли речь об индийской мантре или пении иудейского кантора, о призыве мусульманского муэдзина, о христианском гимне или о кантате Баха, музыка везде преследует единую цель: воздействовать на частоту вибрации каждого слушателя и через гармонический ряд возвести ее на высший духовный уровень» [цит. по: 1, с. 77].